**11 клас**

**1 тур**

**Паважаныя члены журы!**

**У тэарэтычным туры прадугледжана выкананне 8 заданняў, пры правільным рашэнні якіх удзельнікі алімпіяды маглі набраць 219 балаў. Правільныя адказы і прыкладныя крытэрыі выстаўлення балаў за кожны кампанент задання абазначаны ў тэксце адказу.**

I. Паважаныя члены журы!

У заданні I патрабавалася прачытаць фрагмент гістарычнай крыніцы, адказаць на пытанні. Інфармацыя, якая адсутнічала ў удзельнікаў, выдзелена тлустым шрыфтам.

**Максімум за заданне – 32 балы.**

«… даводзім да ведама гэтым нашым лістом … што, жадаючы прымножыць усеагульнае дабро і палепшыць становішча нашага горада … гэты наш горад… з права літоўскага і рускага… на права нямецкае, … пераводзім на вечныя часы. Пастанаўляем і даём ім магчымасць, згодна з гэтым … правам, рабіць поўнае кіраўніцтва…

Жадаем таксама, каб усе жыхары названага горада карысталіся гэтым правам… і ў любой справе ва ўсім яго прытрымліваліся. …Усіх тых людзей аддаляем ад гарадскога і баярскага права і навечна вызваляем іх ад суда і ўлады ўсіх ваявод, паноў і старостаў… А калі хто ў чым будзе вінаваты, павінен, па справядлівасці, устаць перад войтам, бурмістрам і радцамі. Калі ж войт або бурмістры вырашаць несправядліва, тады па гэтай справе павінны будуць выклікацца да нас саміх і нам вырашаць, каго якім правам судзіць…».

1) Укажыце, як называецца гістарычны дакумент, з якога ўзяты дадзены фрагмент.

**[Прывілей гораду Мінску – 3 балы]**

2) Што, згодна з дакументам, атрымліваў горад Мінск?

**[Магдэбургскае права – 2 балы]**

3) У якім годзе быў выдадзены дадзены дакумент?

**[1499 г. – 2 балы]**

4) Кім быў выдадзены дадзены дакумент?

**[Аляксандрам Казіміравічам – 2 балы]**

5) З якой мэтай Мінску давалася новае права?

**[Жыхары вызваляліся ад феадальных павіннасцей, суда і ўлады ваявод, старостаў і іншых дзяржаўных службовых асоб. Мяшчане стваралі органы мясцовага самакіравання, выбіралі свае суды, кантралявалі фінансава-гандлёвую дзейнасць, адказвалі за абарону. Ім**

**гарантаваўся свабодны занятак рамяством, гандлем, земляробствам. Шматлікія натуральныя павіннасці, якія існавалі раней, замяняліся адзіным грашовым падаткам. – 8 балаў (+ да 5 балаў, калі ўдзельнік назаве іншыя правільныя звесткі)]**

6) Як называўся орган, які ажыццяўляў кіраўніцтва горадам? **[Магістрат – 2 балы]**

7) Хто з'яўляўся найвышэйшай службовай асобай у горадзе?

**[Войт – 2 балы]**

8) Які орган ажыццяўляў судаводства па крымінальных справах?

**[Лава – 2 балы]**

9) Які орган ажыццяўляў судаводства па грамадзянскіх і маёмасных справах?

**[Рада – 2 балы]**

10) Укажыце назву спецыяльнага будынка, у якіх размяшчаліся органы гарадскога самакіравання. **[Ратуша – 2 балы]**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – § 27, с. 68–71.

**II**. Паважаныя члены журы!

У заданні II патрабавалася ўважліва разгледзець картасхему і выканаць заданні да яе. Інфармацыя, якая адсутнічала ў удзельнікаў, выдзелена тлустым шрыфтам.

**Максімум за заданне – 20 балаў.**



Разгледзьце картасхему, запішыце назвы чыгунак і гады пачатку руху на чыгунках у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.:

1) абазначана блакітнай лініяй: **Пецярбургска-Варшаўская, 1862 г. (2 балы)**
2) абазначана чырвонай лініяй: **Рыга-Арлоўская, 1866 г. (2 балы)**
3) абазначана аранжавай лініяй: **Маскоўска-Брэсцкая, 1871 г. (2 балы)**
4) абазначана зялёнай лініяй: **Лібава-Роменская, 1873 г. (2 балы)**
5) абазначана карычневай лініяй: **Палескія, 1882 г. (2 балы)**
6) абазначана фіялетавай лініяй: **Вільня-Ровенская (або Палескія), 1884 г. (2 балы)**

7) праз якія беларускія гарады яны праходзілі (абазначаны чорнымі кропкамі): **<u>Брэст</u> (1 бал), <u>Баранавічы</u> (1 бал), <u>Лунінец</u> (1 бал), <u>Гомель</u> (1 бал), <u>Жлобін</u> (1 бал), <u>Мінск</u> (1 бал), <u>Віцебск</u> (1 бал), <u>Орша</u> (1 бал).**

На аснове матэрыялаў: Паноў, С. В. Гісторыя Беларусі, канец XVIII – пачатак XX ст. : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. В. Паноў, С. В. Марозава, У. А. Сосна ; пад рэд. У. А. Сосны. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2018. – § 17–18, с. 79.

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025. – § 8, с. 100.

**III**. Паважаныя члены журы!

У заданні III патрабавалася ўважліва разгледзець малюнак, выканаць заданні да яго.

**Максімум за заданне – 48 балаў (з іх да 15, калі ўдзельнік назаве факты, звязаныя з адлюстраванай падзеяй, якія не пазначаны тут).**




<u>1) Якой гістарычнай падзеі прысвечаны дадзены малюнак?</u>
**Тайпінскае паўстанне (2 балы).**
<u>2) У якім стагоддзі быў створаны малюнак?</u>
**XIX стагоддзе (1 бал).**
<u>3) У якой краіне адбывалася гэта падзея?</u>
**Кітай – 2 балы.**

<u>4) Укажыце перадумовы дадзенай падзеі.</u>

Паражэнне Кітая ў першай «опіумнай» вайне прывяло да заняпаду аўтарытэту Цынскай дынастыі, абвастрэння сацыяльных супярэчнасцей.

**(3 балы)**

<u>5) Укажыце гады, калі адбывалася гэта падзея.</u>

**1850–1864 гг. (2 балы)**

<u>6) Якую назву атрымала дзяржава, абвешчаная ў ходзе дадзенай падзеі?</u>

**«Нябесная дзяржава вялікага працвітання», або «Тайпін цяньго» (4 балы).**

7) Укажыце горад, які стаў сталіцай абвешчанай дзяржавы.

**Нанкін (1 бал).**

8) Хто з’яўляўся правадыром дадзенай падзеі?

**Хун Сюцюань (2 балы)**

9) Якія наступствы мела дадзеная падзея?

Англія і Францыя вырашылі скарыстацца грамадзянскай вайной у Кітаі для чарговай агрэсіі супраць гэтай краіны **(2 балы)**. Пачалася другая «опіумная» вайна 1856–1860 гг. **(2 балы).** Восенню 1860 г. англа-французскія войскі ўвайшлі ў Пекін, пакінуты цынскім імператарам і яго вяльможамі **(3 балы)**. Еўрапейцы рабавалі, знішчалі мірнае насельніцтва, спалілі помнік кітайскай архітэктуры – летнюю рэзідэнцыю (палац) імператара. Там захоўваліся тысячы твораў кітайскага мастацтва **(4 балы)**.

Цынскі ўрад капітуляваў і пайшоў на новыя ўступкі іншаземцам **(2 балы)**. Толькі пасля гэтага еўрапейскія дзяржавы аказалі дапамогу маньчжурскім феадалам у бязлітасным падаўленні тайпінаў. Тайпінскае паўстанне скончылася паражэннем, крайне аслабіўшы Кітай і кіроўную Цынскую дынастыю **(3 балы)**.

На аснове матэрыялаў: Кошалеў, В. С. Сусветная гісторыя Новага часу, XIX – пачатак XX ст. : вучэб. дапаможнік для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. С. Кошалеў, Н. В. Кошалева, Н. В. Байдакова ; пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2018. – § 25, с. 154–156.

**IV**. Паважаныя члены журы!

У дадзеным заданні патрабавалася запоўніць табліцу «Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай згодна з умовамі Люблінскай уніі». Інфармацыя, якая адсутнічала ў удзельнікаў, выдзелена тлустым шрыфтам.

**Максімум за заданне – 18 балаў.**

| Агульнае для ВКЛ і Польшчы | Асобныя для ВКЛ і Польшчы |
|---|---|
| **1.** Манарх<br>**2. Сойм (2 балы)**<br>**3. Знешняя палітыка (2 балы)**<br>**4. Права феадалаў абедзвюх дзяржаў набываць маёнткі на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай (2 балы)** | **1.** Дзяржаўны апарат кіравання<br>**2. Заканадаўства (2 балы)**<br>**3. Судовая сістэма (2 балы)**<br>**4. Войска (2 балы)**<br>**5. Грашовая адзінка (2 балы)**<br>**6. Мова справаводства (2 балы)**<br>**7. Дзяржаўная пячатка (2 балы)** |

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага

ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – § 38–39, с. 187.

**V.** Паважаныя члены журы!

У заданні V патрабавалася пазнаць і падрабязна апісаць гістарычную асобу, паказаную на партрэце.

**Максімум за заданне – 39 балаў (з іх да 15, калі ўдзельнік назаве факты, якія не пазначаны тут).**



Сямён **(1 бал)** Канстанцінавіч **(1 бал)** Цімашэнка **(1 бал)**, гады жыцця: 1895–1970 гг. **(2 балы)**. Маршал Савецкага Саюза **(1 бал)**, двойчы Герой Савецкага Саюза **(1 бал)**. Удзельнік Першай сусветнай **(1 бал)**, Грамадзянскай **(1 бал)** і савецка-фінляндскай войнаў **(1 бал)**. На пасадзе наркама абароны СССР **(1 бал)** – 1939–1940 гг. **(2 балы)** прыняў усе магчымыя меры па больш хуткім умацаванні абараназдольнасці арміі **(1 бал)**: паскорыў працэс пераўзбраення **(1 бал)**, падрыхтоўкі новых кадраў **(1 бал)**, зноў пачаў фарміраванне танкавых карпусоў **(1 бал)**. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўваходзіў у склад Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання **(1 бал)**. З яго імем звязана правядзенне адной з першых паспяховых аперацый – Растоўскай **(1 бал)** – у 1941 г. **(1 бал)**. Пры яго ўдзеле быў праведзены шэраг найбуйнейшых аперацый: Яска-Кішынёўская **(1 бал)** у 1944 г. **(1 бал)**, Венская **(1 бал)** у 1945 г. **(1 бал)**.

На аснове матэрыялаў: Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – § 4, с. 61.

**VI.** Паважаныя члены журы!

У дадзеным заданні патрабавалася размеркаваць прыведзеныя ніжэй звесткі па дзвюх калонках табліцы «Палітычныя партыі рэвалюцыйна-дэмакратычнага накірунку ў Беларусі».

**Максімум за заданне – 14 балаў.**

| Назва партыі | Год утварэння | Сціслая характарыстыка | Задачы партыі |
|---|---|---|---|
| **1. Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (РСДРП)**<br>**<u>(1 бал)</u>** | 1898 г. | **1**<br>**(2 балы)** | Бліжэйшыя задачы: звяржэнне самадзяржаўя, усталяванне дэмакратычнай рэспублікі. Канчатковая мэта – пралетарская рэвалюцыя, пабудова сацыялізму |
| 2. Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі (Бунд) | **1897 г.**<br>**(1 бал)** | **3**<br>**(2 балы)** | Абарона інтарэсаў яўрэйскіх рабочых |
| 3. Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэры) | **1902 г.**<br>**(1 бал)** | На тэрыторыі Беларусі знаходзіўся адзін з асноўных цэнтраў партыі. Партыя лічыла індывідуальны палітычны тэрор эфектыўным спосабам палітычнай дзейнасці | **2**<br>**(2 балы)** |
| **4. Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ)**<br>**<u>(1 бал)</u>** | 1903 г. | **2**<br>**(2 балы)** | **1**<br>**(2 балы)** |

**<u>Назвы партый:</u>** Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ); Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (РСДРП).

**Гады ўтварэння:** 1897 г., 1902 г.

**Сціслая характарыстыка (у табліцу ўпісвайце адпаведныя лічбы):**

1. Неўзабаве пасля стварэння ў выніку арыштаў гэтая партыя страціла кіраўнікоў цэнтральных органаў, што выклікала часовую дэзарганізацыю. Дзейнасць партыі аднавілася толькі ў 1903 г. У канцы 1903 – пачатку 1904 г. групы гэтай партыі з’явіліся ў гарадах Беларусі.
2. Стваральнікамі і лідарамі гэтай партыі былі браты Антон і Іван Луцкевічы, А. Пашкевіч і інш. Пасля I з’езда партыі яна характарызавалася як сацыяльна-палітычная арганізацыя беларускага працоўнага народа.
3. Найбуйнейшая сацыял-дэмакратычная арганізацыя Расійскай імперыі. У пачатку XX ст. арганізацыі гэтай партыі дзейнічалі практычна ва ўсіх гарадах і мястэчках Беларусі.

**Задачы партыі (у табліцу ўпісвайце адпаведныя лічбы):**

1. Звяржэнне самадзяржаўя, усталяванне дэмакратычнай рэспублікі, права народаў Расіі на аўтаномію.
2. Шырокія палітычныя правы і свабоды, звяржэнне самадзяржаўя, усталяванне федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі ў Расіі. Сацыялізацыя зямлі, што прадугледжвала адмену прыватнай уласнасці на зямлю і перадачу яе ў распараджэнне органаў самакіравання, ураўняльнае землекарыстанне.

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025. – § 11, с. 126–127.

**VII.** Паважаныя члены журы!

У заданні VII патрабавалася пазнаць гістарычную асобу па відарысе. Дзе магчыма, неабходна было ўпісаць прозвішча і імя. Правільныя адказы дадзены пад відарысамі і выдзелены тлустым шрыфтам.

**За правільны адказ – да 2 балаў. Максімум за заданне – 18 балаў.**

| | | |
|---|---|---|
|  |  |  |
| **Язэп Драздовіч** На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025. – § 24, с. 286 | **Ігар Бокій** На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025. – § 50, с. 294 | **Мікіта Куканенка** На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. –Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025. – § 47, с. 260 |
|  |  |  |
| **Жыгімонт ІІ Аўгуст** На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. | **Ян Гус** На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – | **Уладзімір Мулявін** Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; |

| | | |
|---|---|---|
| А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – § 42, с. 213 | Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – § 22, с. 27 | пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025. – § 36, с. 137 |
|  |  |  |
| **Георгій Жукаў**<br>На аснове матэрыялаў: Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – § 5–6, с. 70 | **Леў Даватар**<br>На аснове матэрыялаў: Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – § 5–6, с. 74 | **Васіль Корж**<br>На аснове матэрыялаў: Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – § 9, с. 114 |

**VIII.** Паважаныя члены журы!

У дадзеным заданні неабходна было даць максімальна разгорнутае азначэнне да прыведзеных ніжэй паняццяў. Правільныя адказы выдзелены тлустым шрыфтам.

**За кожны разгорнуты адказ – да 3 балаў. Усяго за заданне – да 30 балаў.**

| | |
|---|---|
| 1. «Антыкамінтэрнаўскі пакт» | **дагавор паміж Германіяй і Японіяй, падпісаны 25 лістапада 1936 г. У лістападзе 1937 г. да яго далучылася Італія. Прадугледжваў абмен інфармацыяй аб дзейнасці Камінтэрна і сумесную барацьбу супраць яго.**<br>Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – С. 234 |
| 2. Праведнікі народаў свету | **сучасная назва тых людзей, якія ў час Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў ратавалі асоб яўрэйскай нацыянальнасці.**<br>На аснове матэрыялаў: Паноў, С. В. Гісторыя Беларусі, 1917 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. В. Паноў, У. Н. Сідарцоў, |

| | |
|---|---|
| | В. М. Фамін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. – С. 173 |
| 3. «Зялёная папка» | **кодавая назва германскага плана ваенна-эканамічнага рабавання тэрыторыі СССР у гады Другой сусветнай вайны.**<br>Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – С. 235 |
| 4. Паланізацыя | **сістэма мерапрыемстваў польскіх дзяржаўных органаў улады, устаноў культуры, каталіцкага духавенства па асіміляцыі беларускага насельніцтва.**<br>На аснове матэрыялаў: Паноў, С. В. Гісторыя Беларусі, 1917 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. В. Паноў, У. Н. Сідарцоў, В. М. Фамін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. – С. 173 |
| 5. Фонд Абароны (Фонд Чырвонай Арміі) | **Спецыяльны фонд, на рахункі якога паступалі добраахвотныя ахвяраванні (грашовыя сродкі і матэрыяльныя каштоўнасці), што перадаваліся грамадзянамі СССР на патрэбы фронту ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**<br>Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – С. 237 |
| 6. «Адліга» | **назва перыяду другой паловы 1950-х – першай паловы 1960-х гг., звязанага са змякчэннем палітычнага рэжыму пасля смерці І. В. Сталіна, паступовым пераадоленнем культу яго асобы і пачаткам частковай рэабілітацыі нявінна пацярпелых ад палітычных рэпрэсій.**<br>На аснове матэрыялаў: Паноў, С. В. Гісторыя Беларусі, 1917 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. В. Паноў, У. Н. Сідарцоў, В. М. Фамін. –Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. – С. 169 |
| 7. Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання | **вышэйшы орган стратэгічнага кіраўніцтва Узброенымі Сіламі СССР у гады Вялікай Айчыннай вайны.**<br>Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А.А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – С. 237 |
| 8. Асаднікі | **былыя афіцэры польскай арміі, якіх за заслугі ў польска-савецкай вайне 1919–1921 гг. польскія ўлады надзялялі зямельнымі ўчасткамі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў перыяд яе знаходжання ў складзе Польшчы.**<br>На аснове матэрыялаў: Паноў, С. В. Гісторыя Беларусі, 1917 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. |

| | |
|---|---|
| | адукацыі з беларус. мовай навучання / С. В. Паноў, У. Н. Сідарцоў, В. М. Фамін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. – С. 172 |
| 9. Пацыфізм | **антываенны рух, удзельнікі якога выступаюць супраць любой вайны.**<br>Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – С. 236 |
| 10. Нацыянал-дэмакратызм | **кірунак грамадска-палітычнай думкі, які спалучаў агульнадэмакратычныя ідэі з задачамі сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення прыгнечаных народаў. У Беларусі ўзнік у канцы XIX – пачатку XX ст. і меў на мэце адраджэнне нацыянальнай культуры і самасвядомасці беларускага народа. У сярэдзіне 1920-х гг. абвешчаны Камуністычнай партыяй варожай антысавецкай палітыкай, накіраванай супраць дасягненняў Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.**<br>На аснове матэрыялаў: Паноў, С. В. Гісторыя Беларусі, 1917 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. В. Паноў, У. Н. Сідарцоў, В. М. Фамін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. – С. 171 |